ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 11 (1004) | АЎТОРАК, 5 чэрвеня 2001 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## КУРС НА СТАБІЛІЗАЦЫЮ

18 мая ў Мінску прайшоў II Усебеларускі народны сход. Удзел у ім прынялі 350 дэлегатаў ад Гомельскай вобласці, у тым ліку 73 прадстаўнікі г.Гомеля. Сярод іх — рэктар нашага універсітэта член Савета Рэспублікі М.В.Селькін.

Дэлегаты з'езда абмеркавалі і зацвердзілі Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2001-2005 г.г., арыентаваную на далейшае ўмацаванне эканомікі краіны, рост дабрабыту яе грамадзян.

Ужо ў 2001 годзе сярэднемесячная зарплата ў цэлым па рэспубліцы павінна дасягнуць 100 долараў ЗША ў жніўні, а для работнікаў, якія фінансуюцца з бюджэту, да 30 снежня. У далейшым мяркуецца павялічыць яе да 2005 года ў параўнанні з 2000 годам у 8 разоў. Пры гэтым прадугледжваецца палепшыць адпаведнасць сярэднемесячнай зарплаты і мінімальнага спажывецкага бюджэту.

На Савеце універсітэта

## АДБЫЛІСЯ СКАРЫНАЎСКІЯ ЧЫТАННІ

На пашыраным пасяджэнні Савета універсітэта, якое прайшло ў апошні чацвер мая, адбыліся Скарынаўскія чытанні пераможцаў універсітэцкага конкурсу на лепшую навукова-даследчую работу 2001 года. Сёлета імі сталі: кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры фізічнага выхавання і спорту В.А.Мядзведзеў, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры спартыўных дысцыплін Б.А.Царыкаў, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры В.К.Шынкарэнка і загадчык кафедры грамадзянска-прававых дысцыплін С.Г.Шулейка. Яны выступілі са сваімі навуковымі дакладамі. Рэктар універсітэта прафесар М.В.Селькін уручыў лаўрэатам Скарынаўскіх чытанняў новага стагоддзя адпаведныя дыпломы і грашовыя прэміі.

На Савеце абраны дэлегат прадстаячага II з'езда настаўнікаў Рэспублікі Беларусь. Наш універсітэт на ім будзе прадстаўляць загадчык кафедры беларускай мовы доктар філалагічных навук А.А.Станкевіч.

Старшыня Савета ГДУ па абароне дысертацый па спецыяльнасці "Матэматычная логіка, алгебра і тэорыя лічбаў" членкарэспандэнт НАН Беларусі, прафесар Л.А.Шамяткоў уручыў дыплом доктара фізіка-матэматычных навук загадчыку кафедры вышэйшай матэматыкі У.М.Семенчуку.

Савет разгледзеў кадравыя пытанні. На конкурснай аснове на вакантныя пасады абраны: д.б.н. Л.М.Сапегін — прафесара кафедры батанікі і фізіялогіі раслін, М.В.Каняхін — загадчыка кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту, Б.А.Царыкаў — загадчыка кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры, В.М.Кавалёва — выкладчыка кафедры фізвыхавання і спорту, Н.М.Жукавец і К.В.Гапановіч-Кайдалава — асістэнтаў Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.

Савет хадайнічаў перад ВАК Беларусі аб прысваенні вучонага звання дацэнт Г.В.Гатальскай з кафедры псіхалогіі.

Заслуханы інфармацыі прарэктара па вучэбнай рабоце прафесара С.Ф.Каморнікава аб арганізацыі вясенне-летніх вучэбных і вытворчых практык і адказнага сакратара прыёмнай камісіі С.А. Хахомава аб падрыхтоўцы да прыёму ўступных экзаменаў ва універсітэт.

Былі разгледжаны таксама некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

Выстаўкі

## І ГЭТА ЎСЁ МЫ

***Пад такой назвай у канцы мая – пачатку чэрвеня ў нашым універсітэце працавала выстаўка творчасці, прысвечаная Міжнароднаму дню абароны дзяцей.***

Усіх яе ўдзельнікаў, нягледзячы на абмежаванне іх фізічных магчымасцей з-за розных захворванняў, аб'ядноўвае цяга да творчасці, праз якую яны выказваюць сваё светаўспрыманне.

Шмат работ дзяцей-інвалідаў – цікавых, арыгінальных, выкананых на высокім і мастацкім, і тэхнічным узроўні, убачылі наведвальнікі выстаўкі: жывапіс (масла, акварэль), графіку, разнастайныя вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (разьба па дрэве, інкрустацыя, пляценне з саломкі і лазы, мяккія цацкі, вышыўка, вязанне) і інш. Яны дарылі радасны, светлы настрой, ні ў адной з работ нельга было сустрэць цёмных, журботных фарбаў, усе яны неслі жыццесцвярджальны пачатак, як напрыклад, у жывапісу і графіцы Таццяны Вакарынай і Марыны Сініла, разьбе па дрэве і інкрустацыі Ігара Лапіцкага, ажурных сурвэтках Светы Плотнікавай. Ніколі б не падумалася, што такую прыгажосць можна ствараць не рукамі, бо імі цяжка валодаць з-за цэрэбральнага параліча ці іншай спінна-мазгавой паталогіі, а трымаючы аловак і пэндзаль у зубах, ці націскаючы на клавіятуру камп'ютэра палачкай, замацаванай на абручы, які надзяваеш на галаву. Менавіта так друкаваў свае паэтычныя радкі Сяргей Сапоненка, чыя кніга вершаў аб веры, надзеі, выдадзеная з дапамогай спонсараў, убачыла свет і была прадстаўлена сярод астатніх экспанатаў.

Арганізавалі гэту цудоўную выстаўку асацыяцыя сем'яў дзяцей-інвалідаў з цэрэбральным паралічом і спінна-мазгавымі паталогіямі, Гомельскае раённае дабрачыннае грамадскае аб'яднанне "Сям'я" і мастацкая студыя пры Доме культуры глухіх. Сродкі, сабраныя на ёй (на стале стаяла скрынка для грашовых ахвяраванняў), пойдуць на арганізацыю святаў для дзяцей-інвалідаў.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

Прафарыентацыя

## ДЗЕНЬ АДКРЫТЫХ ДЗВЯРЭЙ – 2001

Стала ўжо добрай традыцыяй штогадова праводзіць у маі ў ГДУ імя Ф.Скарыны Дзень адкрытых дзвярэй для выпускнікоў сярэдніх навучальных устаноў, якія маюць намер працягваць сваю адукацыю ў ВНУ, што па праву лічыцца вядучай у палескім рэгіёне.

Кіраўніцтва універсітэта арганізавала правядзенне Дня такім чынам, каб кожны жадаючы мог атрымаць максімальна поўную інфармацыю аб нашай навучальнай установе. Спачатку будучыя абітурыенты і іх бацькі, якія цалкам запоўнілі вялікую лекцыйную залу 5-га корпуса, мелі магчымасць сустрэцца з прарэктарам па вучэбнай рабоце д.ф.-м.н., прафесарам С.Ф.Каморнікавым, адказным сакратаром прыёмнай камісіі дацэнтам С.А.Хахомавым, садырэктарам аднаго са структурных падраздзяленняў універсітэта — Франка-беларускага інстытута кіравання — дацэнтам А.У.Гаўрылюком, а таксама дэканамі ўсіх факультэтаў.

Сустрэчу адкрыў прафесар С.Ф.Каморнікаў. Ён усебакова асвятліў вучэбную, навуковую, культурна-бытавую сферы жыцця універсітэта. Асабліва адзначыўшы слаўныя старонкі універсітэцкай гісторыі, С.Ф.Каморнікаў падкрэсліў, што прэстыжнасць ГДУ сярод абітурыентаў тлумачыцца не толькі асаблівасцямі попыту і прапановамі на рынку працы ў нашыя дні — яна фарміравалася дзесяцігоддзямі, на працягу якіх старэйшай ВНУ Гомельшчыны належыла і належыць выключна важная роля ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў для розных галін народнай гаспадаркі нашай краіны. Акрамя таго, універсітэт стаў і прызнаным еўрапейскім навуковым цэнтрам. Не выпадкова сёння, калі маладое пакаленне ўсё часцей імкнецца атрымаць не проста вышэйшую адукацыю, а найперш якасныя веды, ГДУ павялічвае рэйтынг папулярнасці сярод ВНУ г.Гомеля.

У навучанні сучаснага студэнта адным з вызначальных з'яўляецца інфармацыйна-тэхнічны фактар. Таму прарэктар па вучэбнай рабоце расказаў аб ролі і ўзроўні камп'ютэрызацыі ва універсітэцкім вучэбным працэсе, аб шырокім дыяпазоне творчых навуковых даследаванняў, што вядуцца ва універсітэце. Шмат увагі С.Ф.Каморнікавым было нададзена і розным аспектам правілаў прыёму ў 2001 годзе.

А.У.Гаўрылюк зрабіў акцэнт у сваім выступленні на асаблівасцях функцыянавання пры універсітэце Франка-беларускага інстытута кіравання, аб умовах вучобы ў ім і перспектывах атрымання яго выпускнікамі двух дзяржаўных дыпломаў — Беларусі і Францыі.

Пасля таго, як прафесар С.Ф.Каморнікаў і іншыя прадстаўнікі універсітэта кампетэнтна адказалі на ўсе пытанні, якія ўзніклі падчас сустрэчы ў прысутных, Дзень адкрытых дзвярэй працягваўся па факультэтах. Кожны мог падрабязна азнаёміцца з жыццём канкрэтнага факультэта, атрымаць кансультацыі дэканаў і выкладчыкаў наконт выбранай спецыяльнасці. А ў час экскурсій па універсітэцкіх аўдыторыях, лабараторыях, камп'ютэрных цэнтрах і лінгафонных кабінетах усе маглі пераканацца, што ў нас створаны дастойныя ўмовы для прафесійнага росту будучых спецыялістаў, для раскрыцця іх навукова-творчага патэнцыялу.

**Сяргей ХАНЕНЯ,**
**нам.дэкана філфака па выхаваўчай і прафарыентацыйнай рабоце.**

## ПЕРАД АДКАЗНЫМ ЖЫЦЦЁВЫМ ВЫБАРАМ

У раённым Доме культуры г.п.Брагін адбыўся І злёт выпускнікоў вясковых школ. Гэта на дзіва яркае, насычанае мерапрыемства — інавацыя раённага вучэбна-метадычнага кабінета, падтрыманая аддзеламі адукацыі, культуры, цэнтрам занятасці насельніцтва, аддзелам па справах моладзі райвыканкама, РК БПСМ.

Асноўная мэта гэтай шырокамаштабнай акцыі — прафарыентацыйная работа сярод моладзі, вучняў 9-х і 11-х класаў, якія рыхтуюцца да важнага жыццёвага кроку — выбару будучай прафесіі і сферы працоўнай дзейнасці. Каб учарашнія дзеці змаглі пазбегнуць непрыемных памылак, не аказаліся ў палоне ілюзій і нязздзейсненых надзей, арганізатары злёту далі магчымасць прадстаўнікам раённых аграпрамысловых прадпрыемстваў, прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, ВНУ і іншых арганізацый Гомельскай вобласці правесці растлумачальную прафарыентацыйную работу.

У злёце выпускнікоў брагінскіх школ прынялі ўдзел у асноўным прадстаўнікі раённых арганізацый, а з абласнога цэнтра прыехалі толькі два: сацыяльны педагог Гомельскага медінстытута М.У.Пракопенкава і дацэнт кафедры давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі нашага універсітэта Т.В.Аўдоніна. Таццяна Віктараўна расказала аб гісторыі ГДУ імя Ф.Скарыны, пазнаёміла выпускнікоў з правіламі прыёму абітурыентаў 2001 года на факультэты універсітэта, адказала на шматлікія пытанні як прафарыентацыйнага характару, так і тыя, што тычыліся вучэбнага, культурнага, спартыўнага жыцця, сацыяльна-бытавых умоў. Арганізатары злёту былі асабліва рады нашаму прадстаўніку, паколькі, па словах намесніка старшыні райвыканкама па інфармаванню насельніцтва і сацыяльных пытаннях Г.М.Бабрынёвай, ГДУ — вядучая ВНУ Беларускага Палесся і вучоба ў ёй учарашніх школьнікаў — вялікі гонар.

Ва ўрачыстым мерапрыемстве прынялі ўдзел 123 дэлегаты ад 12 сярэдніх і 2 базавых школ Брагінскага раёна, якім былі ўручаны камплекты інфармацыйна-рэкламных прафарыентацыйных дакументаў: праспекты і буклеты, якія ўтрымлівалі інфармацыю аб рабочых вакансіях на мясцовых, раённых і абласных прадпрыемствах народнагаспадарчага комплексу Беларусі, распрацаваныя Брагінскім аддзелам цэнтра занятасці насельніцтва; лістоўкі па другаснай занятасці моладзі, падрыхтаваныя РК БПСМ; матэрыялы для абітурыентаў, прадстаўленыя прыёмнымі камісіямі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Хочацца спадзявацца, што на наступны год наш універсітэт лепш "укамплектуе" сваіх прадстаўнікоў на падобных мерапрыемствах і мы таксама зможам надзяліць калі не кожнага сельскага выпускніка, то хаця б кожную вясковую школу неабходнымі прафарыентацыйнымі матэрыяламі.

**(Наш кар.)**

## АЦЭНЕНЫ ВЕДЫ ЮНЫХ

Толькі двое юных, але надзвычай таленавітых гамяльчан удастоіліся права прысутнічаць на сустрэчы з Прэзідэнтам краіны Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам, якая прайшла ў яго рэзідэнцыі.

Кіраўнік дзяржавы прымаў навучэнцкую моладзь, якая праявіла сябе перамогамі ў алімпіядах, конкурсах міжнароднага ўзроўню. Гомельшчыну прадстаўлялі вучні дацэнта кафедры МПК нашага універсітэта М.В.Далінскага – Міхаіл Сварычэўскі (СШ № 60) і сённяшні студэнт БДУ Аляксей Данчанка (выпускнік СШ № 27). Апошняя перамога гэтых юнакоў – міжнародная алімпіяда па інфарматыцы ў Пекіне.

Прыняўшы віншаванні з вуснаў Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі, маладыя людзі, некалькімі днямі пазней, атрымалі падарункі і пачулі цёплыя словы ад старшыні аблвыканкама А. С. Якабсона.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджаны дацэнт кафедры ВМ і праграміравання ГРЫГАРУК Павел Дзям'яnavіч.*

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты гістарычнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры гісторыі Беларусі МІХЕДЗЬКУ Валянціна Аляксеевіча з нагоды зацвярджэння яго БелВАКам у вучонай ступені кандыдата гістарычных навук.*

# ЛАЎРЭАТЫ СКАРЫНАЎСКІХ ЧЫТАННЯЎ 2001 ГОДА



**МЯДЗВЕДЗЕЎ Валерый Анатольевіч — кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры фізічнага выхавання і спорту**

Аўтар цыкла работ "Тэарэтыка-метадычныя асновы аздараўлення школьнікаў сродкамі фізічнай культуры ў неспрыяльных экалагічных умовах", які складаецца з дзвюх манаграфій, выдадзеных у 1999 і 2000 гадах. Адна з іх — "Асаблівасці фізічнага выхавання школьнікаў і студэнтаў Гомельскага рэгіёна" — апублікавана ў сааўтарстве з дацэнтам В.А.Калядой.

Цыкл апублікаваных В.А.Мядзведзевым работ прысвечаны актуальнай тэме аздараўлення школьнікаў сродкамі фізічнай культуры. У ім разглядаецца адзін з прыярытэтных напрамкаў у сістэме фізічнага выхавання школьнікаў, якія жывуць у неспрыяльных экалагічных умовах, — аздараўленчы.

Важнейшым фактарам, які вызначае стан фізічнага здароўя падрастаючага пакалення, з'яўляецца рухальная актыўнасць ва ўсёй сваёй разнастайнасці сродкаў і метадаў уздзеяння на арганізм удзельнікаў педагагічнага працэсу. Разам з тым змест і асаблівасці фізічнага выхавання павінны ўлічваць умовы акаляючага асяроддзя, у тым ліку і радыяцыйныя.

Работы выкананы на аснове шматгадовых назіранняў за морфафункцыянальнымі паказчыкамі дзяцей і падлеткаў, якія жывуць на тэрыторыях з розным узроўнем радыеактыўнага забруджвання. Атрыманыя вынікі сталі падставай для стварэння аздараўленчых тэхналогій фізічнага выхавання школьнікаў, дазваляюць аптымізаваць навучальны працэс.



**ЦАРЫКАЎ Барыс Андрэевіч — кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры спартыўных дысцыплін**

Яго пяру належыць цыкл работ "Тэхнічная падрыхтоўка баскетбалістаў на аснове індывідуалізацыі працэсу навучання", у які ўваходзіць манаграфія "Навукова-метадычныя падыходы да тэхнічнай падрыхтоўкі баскетбалістаў на аснове індывідуалізацыі працэсу навучання" (1999 г.), пяць артыкулаў у зборніках, а таксама два акты ўкаранення вынікаў навукова-даследчых работ у практыку. Яго даследаванні ўяўляюць сабой навукова-практычны матэрыял для арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу па баскетболу як на пачатковым этапе навучання (напрыклад, на ўроках у школе або ў групах пачатковай падрыхтоўкі ў ДЮСШ), так і ў рабоце прафесіянальных каманд на аснове вызначэння індывідуальна-тыпалагічных адрозненняў баскетбалістаў высокай кваліфікацыі па асноўных уласцівасцях нярвовай сістэмы.

Аўтарам дадзены рэкамендацыі аб уздзеянні гэтых уласцівасцей на эфектыўнасць гульнявых дзеянняў спартсменаў у працэсе афіцыйных спаборніцтваў. У рэкамендацыях выкарыстаны метады індывідуалізацыі навучання тэхніцы гульні ў баскетбол. Гэтыя рэкамендацыі заснаваны на ідэях разгалінаванага праграмаванага навучання, што дазваляе ўдасканальваць існуючыя навучальныя праграмы для дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ. Выкарыстанне ў практычнай рабоце раней выяўленых і найбольш значных уласцівасцей нярвовай сістэмы баскетбалістаў дае магчымасць нарошчваць або ўтрымліваць эфектыўныя гульнявыя дзеянні па ходу спартыўных спаборніцтваў і пры падрыхтоўцы да іх.



**ШЫНКАРЭНКА Вольга Карпаўна — кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры**

Аўтар цыкла работ "Сучасная беларуская гістарычная проза", у які ўваходзяць дзве манаграфіі і чатыры артыкулы, апублікаваныя ў рэспубліканскіх часопісах і зборніках, а таксама ў часопісах далёкага замежжа. Пытанні сучаснай беларускай гістарычнай прозы разглядаюцца на прыкладах творчасці У.Караткевіча, Л.Дайнэкі, В.Іпатавай, К.Тарасава, У.Арлова, І.Шамякіна, Г.Далідовіча.

Упершыню ў літаратуразнаўстве Беларусі сістэматызаваны шэраг асаблівасцей, уласцівых менавіта сучаснай беларускай гістарычнай прозе. У першай манаграфіі "Пад ветразем Дабра і Прыгажосці" (1995 г. выдання) разглядаюцца асаблівасці творчай манеры вядомага беларускага пісьменніка У.Караткевіча, адзначаецца непаўторнасць яго мастацкай індывідуальнасці. Асаблівая ўвага ўдзяляецца жанрава-стылёвым пошукам мастака ў галіне прозы, якая складае значную частку яго багатай спадчыны і ўвабрала ў сябе найбольш яркія грані таленту празаіка.

У манаграфіі "На скрыжалях гісторыі" (1999 г.) у якасці самастойнага аб'екта даследавання паўстаюць праблемы паэтыкі гістарычнага жанру на матэрыяле сучаснай прозы з пераважаючай арыентацыяй на аналіз мастацкіх тэкстаў, іх структуру, ідэйна-вобразных і стылістычных асаблівасцей. Гістарычны жанр характарызуецца як самастойная літаратурная з'ява, надзеленая выразнымі змястоўна-фармальнымі асаблівасцямі, якія будуецца і існуе ў мастацкім свеце пісьменніка па сваіх асаблівых законах.



**ШУЛЕЙКА Сяргей Георгіевіч — загадчык кафедры грамадзянска-прававых дысцыплін**

Аўтар манаграфіі "Пытанні рэгулявання замежных інвестыцый: інстытуцыянальны аспект" (2000 г. выдання).

Праблема прыцягнення замежных інвестыцый вельмі важная для Беларусі, так як у краіне за апошнія гады разгарнуўся глыбокі інвестыцыйны крызіс. Далейшае развіццё яго ў бліжэйшы час можа прывесці да незваротнага падзення вытворчасці. Пераадоленне гэтага крызісу магчыма толькі пры глыбокім рэфарміраванні эканомікі ў цэлым. Складанасць праблемы заключаецца ў тым, што раней існуючы механізм інвесціравання зламаны, а новы знаходзіцца ў працэсе станаўлення.

У манаграфіі разглядаюцца некаторыя праблемы рэгулявання замежных інвестыцый у Беларусі — стварэнне спрыяльнага інвестыцыйнага клімату, дзяржаўнае кіраванне інвестыцыйных працэсаў, механізмаў рэалізацыі гарантый і льгот замежным інвестарам. Аналізуецца замежны вопыт прыцягнення замежнага капіталу, а таксама практыка прымянення інвестыцыйнага заканадаўства ў Беларусі.

Манаграфія дапамагае асэнсаваць з тэарэтычных пазіцый і на аснове практычнага вопыту прычыны правалу інвестыцыйнай палітыкі ў нашай дзяржаве. У даследаванні аналізуюцца і прапануюцца шляхі вырашэння некаторых праблем, звязаных з прыцягненнем у нацыянальную эканоміку замежных капіталаў.

У манаграфіі сфармуляваны прапановы, накіраваныя на далейшую аптымізацыю рэгулявання замежных інвестыцый.

## "СТУДЭНЦКІ СЕРВІС" БЯРЭ ПАЧАТАК У ГДУ

Вучэбны працэс шырокапрофільнай ВНУ — заўсёды не з лёгкіх, бо патрабуе асаблівага цярпення, напружанай разумовай працы, якая аднімае тым самым і шмат вольнага часу. Але якой бы складанай не здавалася вучоба, наша студэнцтва заўсёды імкнулася да самастойнага выхаду на рынак працы.

Спецыяльная пастанова "Аб другаснай занятасці студэнцкай і навучэнцкай моладзі ў вольны ад вучобы час" дзейнічае з 1997 года і па сённяшні дзень належным чынам падтрымліваецца Прэзідэнтам Беларусі, Міністэрствам адукацыі, Дзяржаўным камітэтам па справах моладзі, а таксама мясцовымі распарадчымі органамі ўлады.

Сацыялагічныя даследаванні, якія былі нядаўна праведзены ў нашым універсітэце, паказалі, што 87 працэнтаў студэнтаў жадалі б падпрацаваць у вольны ад вучобы час. Дадзеным напрамкам у ГДУ вырашылі заняцца самым сур'ёзным чынам. Гомельскі ўніверсітэт стаў адзінай пакуль што ў рэспубліцы ВНУ, на базе якой адкрыўся свой, уласны, афіцыйна зарэгістраваны Цэнтр другаснай занятасці студэнцкай моладзі.

Каб пазбегнуць розных крыватолкаў, новаспечаная універсітэцкая структура адразу ж пачала выконваць свае непасрэдныя абавязкі.

Стварэнне "Студэнцкага сервісу", а менавіта так ён цяпер называецца, прыйшлося на гарачы перыяд — экзаменацыйную сесію, канец навучальнага года. Але менавіта летам студэнт з асаблівым жаданнем імкнецца і адпачыць, і зарабіць.

Ужо рыхтуецца да адпраўкі ў Краснадарскі край першы студэнцкі атрад. Юнакі і дзяўчаты будуць працаваць на ўборцы алычы, вішні і чарэшні. Студэнтаў ГДУ ў якасці педагогаў і выхавацеляў сёння рады прыняць санаторна-курортныя ўстановы Чарнамор'я, а таксама аздараўленчыя лагеры і базы адпачынку свайго рэгіёна.

Служба занятасці студэнтаў хутка будзе мець інфармацыйную базу дадзеных аб часовых свабодных рабочых месцах, якія ёсць у нашым горадзе. Але галоўным напрамкам новай структуры з'яўляецца тое, што студэнты будуць працаўладкоўвацца не толькі на летнія сезонныя работы, але і круглагадова, у вольны ад вучобы час, у выхадныя і святочныя дні. Перш за ўсё універсітэцкая моладзь пачне рамонтна-будаўнічыя работы ў сваёй навучальнай установе. Абазначаны і іншыя віды дзейнасці: гэта мастацка-афармленчая, кур'ерская, выдавецкая, экскурсаводства, сацыяльнае абслугоўванне пенсіянераў, інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, якія шмат часу працавалі ва універсітэце.

У самым цесным кантакце студэнцкі цэнтр занятасці будзе працаваць з Беларускім патрыятычным саюзам моладзі, а таксама з гарадскім цэнтрам занятасці насельніцтва, які выступае галоўным размеркавальнікам фінансавых сродкаў у гэтым накірунку.

Стварэнне новай, унутрыуніверсітэцкай штатнай структуры адобрана абласным і гарадскім выканаўчымі камітэтамі, і перш за ўсё вялікім педагагічным калектывам універсітэта, які ніколі не сумняваўся ў тым, што працоўнае выхаванне заўсёды займала не апошняе месца ў развіцці сучаснага грамадства. Варта з гэтым пагадзіцца і дапамагчы адкрыць нашай моладзі шырокую дарогу дзеля здзяйснення такога важнага на сённяшні дзень накірунку. Хто ведае, можа да рашаючага кроку па гэтай дарозе далучацца і іншыя навучальныя ўстановы?

А "Студэнцкаму сервісу" Гомельскага універсітэта застаецца пажадаць спадарожнага ветру на выбраным шляху!

(За даведкамі звяртацца ў галоўны корпус, пакой 4-10, тэл. 56-73-90).

**Л.КАРНАВУШАНКА,**
**кіраўнік службы другаснай занятасці студэнтаў "Студэнцкі сервіс".**



## КАКИМ УВИДИМ ГОМЕЛЬ В 21-М ВЕКЕ?

***Думается, этим вопросом, отвлекаясь от однообразных будней, задаются горожане в начале нового столетия.***

–Конечно же, город станет еще краше, – заверил главный архитектор «Гомельгражданпроекта» Сергей Кривошеев. – Мы делаем и будем делать его все лучше и лучше. И на это нацелен новый генеральный план Гомеля, в разработке которого принимает участие наш институт.

**–Что же предусматривает этот важнейший архитектурный документ, на что надеяться нам, гомельчанам?**

–Того строительного бума, что еще свеж в памяти многих, уже не намечается. Под жилищное строительство выбраны несколько перспективных площадок. В Волотове это 18-й и 19-й микрорайоны, которые будут располагаться справа от улицы Мазурова. Проект последнего уже сделан и прошел экспертизу, готовится рабочая документация.

В Советском районе перспективное место для строительства – площадка в районе областной клинической больницы и технического университета. Проект предлагаемого для размещения здесь микрорайона уже давно готов. Это так называемая «шведская горка», вот только денег на воплощение планов все не было. Хочется надеяться, что средства все же найдутся, и новостройка будет формировать речную панораму города. Нашлись же деньги на воплощение проекта 22-го микрорайона, что на слиянии улиц Советской и Кирова. Работы там уже идут. Это тоже детище «Гомельгражданпроекта».

Одновременно генпланом намечено развитие Гомеля одноэтажного. Выбрано несколько площадок под частную застройку. Самые крупные из них – в районе Прибора и по направлению к Зябровке. Естественно, с сохранением лесных массивов.

Наш город называют голубоглазым. Это из-за множества озер, расположенных на его территории, и близости реки. Солидный объем работ согласно генплану будет направлен на то, чтобы облагородить их берега. Существует уже проект водно-зеленого диаметра Гомеля, предусматривающий систему озер, парков. В той же Волотове заросшие нынче водоемы и дикое Бурое болото планируется превратить в мощный культурно-общественный центр, с гостиницей, стадионом, солидными торговыми точками.

Кажущиеся сегодня фантастическими задумки можно продолжать опи-сывать и далее. Надеюсь и верю, что все они станут действительностью.

Я глубоко убежден в том, – подытожил Сергей Павлович, – что наши творческие замыслы воплотятся в реальность. Жизнь показывает: задуманное нами сбывается.



Театральные премьеры

# "В КАЖДОМ ИЗ НАС – БОГ"

Под таким названием в Молодежном театре прошла премьера пьесы, которая, прежде всего, поразила зрителей высоким мастерством актерского коллектива, специфическим композиционным построением произведения и оригинальностью оформления зала. В нем царил обволакивающий мягкий полумрак, мерцали огоньки свеч на фоне изображения православного храма, и ненавязчиво звучала музыка, которая, сливаясь с голосами актеров, как бы проникала в глубины зрительских душ, вызывая в них мысли и чувства сопереживания.

Актерский коллектив в составе 4-х человек своей игрой, перевоплощением сумели собрать воедино весь калейдоскоп композиционных осколков пьесы, состоящей из стихов и отрывков из писем М.Цветаевой и монологов из "Мастера и Маргариты" М.Булгакова. Этим самым еще раз возвращались к жизни их бессмертные произведения, и как бы они были показаны нам с совершенно другой стороны, со стороны их веры и любви к Богу. И именно через их интерпретацию библейского сюжета вызвали в зрительских душах те религиозные ощущения, которые особенно остро чувствовались в предпасхальные, предпраздничные дни, когда далеко в воздухе разносился перезвон колоколов, сгоняющий с веток деревьев стаи ворон, и, быстро бегущие, вечно спешащие куда-то пешеходы вдруг останавливались, вспоминая, что уже весна.

Лично на меня огромное впечатление произвел голос мужчины, актера, который играл роль Пилата. Голос стенал и плакал, карал и миловал, очаровывая и обвораживая, заставляя находиться в постоянном напряжении и сопереживании.

Таким образом, пьеса, несмотря на свою непродолжительность, сумела соединить воедино не только Цветаеву и Булгакова, но и, выступив как связующий мостик, еще раз указала нам на истинные человеческие чувства и ценности, которые мы размениваем направо и налево, не задумываясь о грозящих последствиях.

Никто не требует от нас слепой веры и религиозного фанатизма, просто всегда нужно помнить о том, что "в каждом из нас – Бог"...

**Елена ПРИЩЕПОВА,**
**студентка гр. Р-12 филологического факультета.**



# ГІЛЬ БАРЫС МІКАЛАЕВІЧ

Пасля цяжкай хваробы перастала біцца сэрца дырэктара спартклуба Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны ГІЛЯ Барыса Мікалаевіча.

Б.М.Гіль нарадзіўся 14 лютага 1944 г. у горадзе Баранавічы. Пасля заканчэння сярэдняй школы працаваў на заводзе аўтаагрэгатаў токарам-станочнікам. У 1962 г. паступіў у Гомельскі пединститут імя В.П.Чкалава, адкуль быў прызваны ў рады Савецкай Арміі. Пасля воінскай службы працягваў вучобу ў інстытуце, які закончыў у 1969 г., атрымаў дыплом аб вышэйшай адукацыі і стаў працаваць трэнерам па плаванню ў ДЮСШ № 3 г.Гомеля.

30 гадоў жыцця Барыса Мікалаевіча звязаны з нашым універсітэтам, факультэтам фізічнага выхавання, дзе ён працаваў да сваіх апошніх дзён – спачатку выкладчыкам, ст.выкладчыкам, а з 1999 г. дырэктарам спартыўнага клуба ГДУ.

Б.М.Гіль быў вядучым спецыялістам па плаванню. Ім падрыхтаваны чэмпіёны і прызёры спаборніцтваў рознага ўзроўню. Каманда плыўцоў нашага універсітэта, якой кіраваў Барыс Мікалаевіч, на працягу многіх гадоў станавілася пераможцай спаборніцтваў сярод ВНУ рэспублікі.

Светлая памяць аб Барысу Мікалаевічу Гілю назаўжды захаваецца ў нашых сэрцах

**ГРУПА ТАВАРЫШАЎ.**

Возрождение традиции

# ЗВУЧАТ ОРКЕСТРОВ ТРУБЫ



С недавних пор в нашем городе одним праздником стало больше. И это «Праздник духовой музыки». В нынешнем году он был особенным. Но обо всем по порядку.

Наверное, каждый внимательный человек, проходя по площади Ленина, мог заметить, что здесь появился необычный указатель: "До Чернигова – 110 км, до Брянска – 285 км, до Минска – 307 км". Именно он стал той точкой, к которой с указанных направлений в конце апреля стали стекаться люди. А еще осенью 2000 г. по указанным направлениям было разослано 30 приглашений участвовать в празднике-конкурсе духовой музыки. И 29 апреля этого года новый указатель уже приветствовал гостей Гомеля – духовые оркестры из Брянской, Минской, Гомельской, Черниговской областей.

Необходимо сказать, что праздники духовой музыки в Гомеле проводились еще в XIX веке, когда ярче всех "блистал касками, трубами и талантами" оркестр вольно-пожарной общины. Однако с началом войн XX в. эта традиция постепенно стала угасать. Но весна прошлого года возродила этот праздник, а нынешний апрель почти в два раза увеличил количество участников, подарив в два раза больше встреч, радости и музыки.

И серый безжизненный камень указателя стал свидетелем почти сказочных событий, которых на празднике духовой музыки было немало.

Так А.П.Грачук (представитель Народного духового оркестра Черниговской области) рассказывал, что здесь, на празднике, он встретился со своим братом (тоже музыкантом), который приехал вместе с духовым оркестром из г.Мозыря. Невероятным в этой истории является то, что братья не виделись 14 лет.

А сколько радости было в глазах пожилых людей, вспоминавших под звуки духовой музыки свою молодость!

Радует и то, что понимают, ценят и просто любят духовую музыку не только представители старшего поколения. Об этом говорит возраст участников – от 11 до 73 лет. Очень многие из них говорили о необходимости не только продолжать традицию, но и искать пути ее преобразования и развития. Не только слова говорят о такой привязанности к духовой музыке, но и возросшее количество новых, сравнительно недавно появившихся, но уже достигших успехов, оркестров. Среди них заметно выделяется духовой оркестр Гомельского музыкально-педагогического колледжа имени Л.С.Выготского под управлением И.С.Орлова, который открывал парад. Вот что говорит о своем оркестре его представитель Д.В.Мышлякевич: "Нашему оркестру три года. Его коллектив – это организм, в котором, сами понимаете, не может быть лидеров или отстающих: каждый важен на своем месте, только тогда гармония совместной работы перерастет в музыкальную гармонию".

Действительно, быть одним целым – не простая задача: у каждого свои интересы, свои взгляды. Нужно сказать еще и о том, что коллектив оркестра музыкально-педагогического колледжа состоит не только из гомельчан (география его участников охватывает территорию от Брестской до Брянской области).

Вот так приветствовала весна 2001 года г.Гомель и его гостей, творя чудеса музыки и судьбы. А может творила не она? Может, творили мы сами? А весна и серый указатель – просто хороший повод стать ближе. Тогда что же мешает нам найти побольше таких поводов?

И еще, пожалуй, самое главное, о чем хотелось бы сказать. Очень жаль, что на этом празднике не было духового оркестра, представляющего наш университет. А ведь когда-то такой оркестр существовал, и университет мог им гордиться. Так что же случилось? Что сейчас мешает возродить эту традицию? Неужели в нашем университете перевелись таланты? Кто-то может возразить, что трудно в нынешних условиях создать духовой оркестр. Но ведь другие смогли. Так чем же мы хуже?!

**Е.ПРОТЧЕНКО,**
**О.АЛИФЕРОВИЧ,**
**студентки гр. Р-11 филологического факультета.**

Кнігі нашых вучоных

# ДАПАМОЖНІК ПА НАВЕЙШАЙ ГІСТОРЫІ



***Нядаўна ў нашым універсітэце праводзілася выстава-агляд метадычных прац, падрыхтаваных выкладчыкамі ГДУ. Адным з яе лаўрэатаў стаў і дацэнт Р.Р.Лазько.***

Такую высокую адзнаку атрымала яго праца па стварэнню некалькіх падручнікаў па навейшай гісторыі – як для школы, так і для ВНУ. Хацелася б звярнуць увагу студэнтаў-гісторыкаў на вучэбны дапаможнік Р.Р.Лазько "Навейшая гісторыя краін Еўропы і Амерыкі 1945-1999 г.г." Названае выданне атрымала грыф Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь як вучэбны дапаможнік для студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ. Гэта азначае яго адпаведнасць вучэбнаму плану, праграме дысцыпліны і рэкамендацыю да выкарыстання ў вучэбным працэсе. Неабходна зазначыць, што гэта першая навукова-метадычная праца такога ўзроўню ў нашай краіне. У гэтай справе наш універсітэт апярэдзіў вядучыя ВНУ Мінска.

Курсу навейшай гісторыі Еўропы і Амерыкі належыць выключна важная роля ў справе падрыхтоўкі спецыялістаў-гісторыкаў. Ён нясе на сабе вялікую пазнавальную, прафесійна-развіваючую, выхаваўчую і светапоглядную нагрузку. Вучэбны дапаможнік Р.Р.Лазько прысвечаны таму перыяду ў гісторыі заходняй індустрыяльнай цывілізацыі, калі яна пераадолела крызіс, у якім знаходзілася ў першай палове XX ст. Пасля другой сусветнай вайны заходняя цывілізацыя выходзіць на новы, больш высокі ўзровень развіцця. Яна становіцца постіндустрыяльнай, аб чым сведчыць зусім іншая мадэль эканомікі, якая грунтуецца на інфармацыйных тэхналогіях, і адпаведна новыя формы грамадскага жыцця.

Складанасць вывучэння сучаснай гісторыі заключаецца ў тым, што даследчык стаіць да яе храналагічна блізка, а часам і з'яўляецца ўдзельнікам падзей, якія даследуе. Таму яму няпроста забяспечыць аб'ектыўнасць. Акрамя таго, час ідзе, а з ім змяняецца і верхняя храналагічная мяжа навейшай гісторыі. Закрытымі для даследчыка застаюцца многія крыніцы, якія датычацца сучасных падзей. У сувязі з гэтым узнікаюць вялікія праблемы па падрыхтоўцы як навуковых, так і вучэбна-метадычных прац па гісторыі пасляваеннага перыяду. Такім чынам, забеспячэнне вучэбнага працэсу вучэбнай і метадычнай літаратурай па навейшай гісторыі з'яўляецца не толькі нялёгкай, але і заўсёды актуальнай задачай. Значным укладам у яе вырашэнне якраз і з'яўляецца вучэбны дапаможнік Р.Р.Лазько.

У дапаможніку раскрыты важнейшыя тэндэнцыі развіцця заходняга грамадства ў эканамічнай, палітычнай, сацыяльнай сферах, прасочваюцца важнейшыя працэсы і падзеі ў пасляваеннай гісторыі буйнейшых краін Захаду. Асобныя раздзелы прысвечаны гісторыі лацінаамерыканскай цывілізацыі і краін Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы. Трактоўка аўтарам гістарычных падзей і працэсаў абапіраецца на апошнія дасягненні гістарычнай навукі. Пры гэтым выкарыстоўваецца багаты і дакладны апарат навуковых паняццяў. Змешчаны ў дапаможніку матэрыял пададзены ў даступнай для студэнтаў форме, што спрыяе яго добраму засваенню.

Застаецца толькі выказаць шкадаванне, што абмежаваны аб'ём дапаможніка. Гэта не дазволіла больш дэталёва разгледзець многія важныя праблемы і ўключыць у яго структуру тэмы, прысвечаныя такім краінам, як Канада, Іспанія, якія па прычыне сваёй ролі ў сучасным свеце цалкам гэтага заслугоўваюць.

**М.МЯЗГА,**
**кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты універсітэта смуткуюць з выпадку заўчаснай смерці дырэктара спартклуба **ГІЛЯ Барыса Мікалаевіча** і выказваюць глыбокае спачуванне яго сям'і, родным і блізкім.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Песіна, 80, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 319.
Падпісана да друку 1.06.2001 г.